29 ВЕРАСНЯ 1999г. СЕРАДА

НАВІНЫ

№111 (642) WWW.SVABODA.COM КОШТ СВАБОДНЫ

Дорогие читатели!

Вы держите в руках последний номер НАВІН. Но мы не прощаемся — НАША СВАБОДА придет к вам уже в ближайшее время!

наша Свабода

Политическая расправа

Власти посчитали недостаточным экономическое уничтожение НАВІН и решили расправиться с газетой более изощренным способом – под прицелом оказалась типография, газетная бумага и даже печатные матрицы.

Еще не успели затихнуть споры вокруг беспрецедентного судебного процесса над нашей газетой по иску госсекретаря Совета Безопасности Виктора Шеймана, как власти придумали новый способ борьбы с неугодными журналистами.

Как известно, накануне, не дожидаясь судебного процесса, обслуживающие власть соответствующие органы арестовали расчетный счет издания, а судебный исполнитель Московского суда описал все имущество редакции и журналиста. Власти ожидали, что этих мер будет достаточно для того, чтобы наши читатели остались без НАВІН. Но не тут-то было. Мы приняли вызов и решили держать оборону до конца.

Наша газета, несмотря на все сложности и каждодневную травлю, продолжала выходить, а прямое указание Александра Лукашенко о закрытии газеты не было выполнено. И тогда чиновники придумали новый «ход». Московский суд, наложивший еще ранее арест на имущество газеты, снарядил своего судебного исполнителя Изварина на этот раз в типографию, где этот человек, ссылаясь на арест всего, что принадлежит газете, потребовал остановить печатание очередного номера НАВІН. Более того, он подверг аресту газетную бумагу. Чудом и благодаря хорошим людям нам все-таки удалось выпустить последний номер, который вы держите в руках.

События вокруг газеты подтвердили тот факт, что иск и суд были лишь прикрытием для хорошо спланированной акции властей по закрытию нашей газеты. Мы мешали Лукашенко и его окружению наводить страх на наших граждан и расправляться с инакомыслящими, потому что несли правду. За это нас закрыли.

Но мы не прощаемся. Мы будем работать для тебя, дорогой читатель, только теперь под новым названием – НАША СВАБОДА. ■

ВНИМАНИЕ, УТОЧНЯЕМ!

Уважаемые подписчики газеты НАВІНЫ!

В последнее время властями развернута травля нашего издания, и оно может прекратить свое существование в любой момент. Но, несмотря ни на что, мы хотим выполнить свои обязательства перед вами. Поэтому просим вас прислать на адрес редакции **копию** подписного купона. Всем, кто пришлет свои подписные купоны, будет высылаться новая газета «Наша свабода».

Наш адрес: 220034, г.Минск, ул. З.Бедули, 6 – 47

Рабочыя супраць збяднення

Заўтра ў Мінску адбудзецца акцыя пратэсту рабочых, наладжаная афіцыйным і свабодным прафсаюзамі. Мінскія ўлады далі дазвол на правядзенне мітынгу ў раёне плошчы Бангалор з 17 да 19 гадзінаў.

Расціслаў ПЕРМЯКОЎ

Як паведаміў нам намеснік старшыні Федэрацыі Прафсаюзаў Беларускай Мікалай Беланоўскі, яны мяркуюць сабраць на акцыю не менш за 50 тысяч чалавек.

А 16 гадзіне рабочыя будуць збірацца ў 4 кропках Мінска: ля прахадной трактарнага завода, на плошчы Якуба Коласа, ля Палаца культуры чыгуначнікаў і ля штабкватэры ФПБ на праспекце Машэрава, 21. З гэтых месцаў калоны рушаць на плошчу Бангалор. Па словах М.Беланоўскага, прафсаюзы не атрымалі дазволу на *шэсце* па гораду, аднак узгаднілі з уладамі магчымасць арганізаванага *праходу* да месца правядзення мітынгу.

Галаўны боль для Лукашэнкі

Акцыя на МАЗе пачнецца раней. Ужо ў 11 гадзінаў раніцы многія рабочыя распачнуць папераджальную забастоўку ў знак пратэсту, супраць уціску кіраўніцтва завода на сябраў Свабоднага прафсаюза.

Адзін з арганізатараў прафсаюзнай акцыі Віктар Івашкевіч паведаміў, што, забараніўшы прафсаюзным лідэрам правядзенне акцыі ў цэнтры горада, улады парушылі Міжнародны пакт аб палітычных і грамадскіх правах, падпісаны Беларуссю.

Акрамя таго, стала вядома, што арганізатары мітынгу працоўных і «Маршу свабоды» вырашылі аб'яднаць свае высілкі і маюць намер заклікаць рабочых падтрымаць акцыю 17 кастрычніка. ■

Марныя пошукі

Ці магчыма, каб Віктар Ганчар разгульваў з Сямёнам Шарэцкім у цэнтры Вільні? Журналісты вядучай літоўскай газеты Lietuvos Rytas сцвярджаюць, што Ганчар – гэта не іголка ў стозе сена.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

У мінулыя выхадныя дзяржаўная газета «Беларуская ніва» паведаміла сенсацыйную навіну. Вядомага апазіцыйнага Віктара Ганчара бачылі ў Вільні 19 верасня – праз тры дні пасля яго таямнічага знікнення ў цэнтры Мінска. З гэтай нагоды мы вырашылі правесці сваё невялікае расследаванне.

«Беларуская ніва» паведаміла, што Ганчара бачыў у Вільні Анатоль Васільчанка, які разам з сынам нібыта ездзіў у сталіцу Літвы па прыватных справах. Васільчанка сцвярджае, што сустрэў Віктара Ганчара разам з Сямёнам Шарэцкім прыкладна ў 13:30 дня ў самым цэнтры Вільні на плошчы Гедыміна каля кнігарні. Анатоль Васільчанка нібыта падышоў да Ганчара і задаў яму пытанне, маўляў, «як жа так, Віктар Іосіфавіч, на вас у Мінску аб'яўлены вышук, а вы ў Літве? Як вы сюды трапілі?» Паводле публікацыі «Беларускай нівы», вядомы апазіцыянер сказаў, што трапіў у Літву легальным чынам, прыехаў у Вільню на цягніку, пасля чаго ён і Шарэцкі нібыта заўсміхаліся. Паводле словаў Васільчанкі, Віктар Ганчар таксама сказаў, што ягоная жонка Зінаіда ведае аб тым, што ён знаходзіцца ў Вільні.

У панядзелак БТ гісторыю «з'яўлення» Ганчара ў Літве падало як адну з самых сенсацыйных навінаў дня. Але абсалютна нельга выключаць, што гэтая сенсацыя высмактаная з пальца. Так, адзін з журналістаў «Частного детектива» сказаў мне, што Анатоль Васільчанка, які працуе начальнікам аддзела распаўсюджвання, – чалавек пажылы, мог нешта наблытаць, і таму не варта даваць веры таму, што ён

Віктар Ганчар два гады таму на акцыі беларускіх журналістаў

кажа. Акрамя таго, у прыватнай размове з нашым прадстаўніком супрацоўнікі «Частного детектива» паведамілі нашаму карэспандэнту, што размаўлялі з сынам Васільчанкі Алегам. Алег, быццам бы, не пацвердзіў факт паездкі ў Вільню.

Зінаіда Ганчар наогул заявіла, што не збіраецца каментаваць трызненні невядома каго. Жонка Віктара Іосіфавіча ўжо перадала сваю афіцыйную заяву з нагоды апублікаванага ў «Беларускай ніве» матэрыялу следчаму мінскай гарадской пракуратуры, які вядзе пошук яе мужа. У ёй спадарыня Ганчар просіць следства разабрацца, хто такі Анатоль Васільчанка, чаму ён паведаміў гэтую інфармацыю і якім чынам Віктар Іосіфавіч мог трапіць у Вільню. Усе сумненні наконт аб'яўлення Ганчара ў Літве мог бы развеяць Сямён Шарэцкі. Аднак на працягу ўсяго ўчарашняга дня віленскі тэлефон Сямёна Георгіевіча маўчаў.

У версію знаходжання Віктара Ганчара за мяжой, які спакойна гуляе па вуліцах літоўскай сталіцы, цяжка паверыць. Выконваючы абавязкі старшыні Вярхоўнага Савета Віктар Ганчар – чалавек вядомы, і таму яму было б вельмі цяжка схавацца ад сведак і журналістаў нават у замежнай краіне. І тым больш разгульваць па вуліцах пад ручку з Сямёнам Шарэцкім, які дзень і ноч знаходзіцца пад аховай літоўскай службы бяспекі. Такі паварот падзеяў неверагодны. Таму версія, што Ганчар у Літве, не вытрымлівае крытыкі...

НАВІНЫ звязаліся з супрацоўнікамі аддзела палітыкі ўплывовай віленскай газеты *Lietuvos Rytas*. Мы спыталіся ў журналістаў, ці магчымая сітуацыя, каб Ганчар не заўважана з'явіўся ў Літве. Літоўскія калегі паведамілі, што абсалютна немагчыма, каб Ганчар больш за тыдзень знаходзіўся ў іхнай краіне і пра гэта не паведаміла ніводная літоўская СМІ. Да таго ж, кожны крок Сямёна Шарэцкага адсочваецца літоўскімі СМІ. «Фігуры Ганчара і Шарэцкага ў Літве вядомыя, і мас-медыя надаюць гэтым людзям вялікую ўвагу, таму, калі б Віктар Ганчар сапраўды з'явіўся ў Вільні, інфармацыя аб гэтым ужо б даўно прасачылася», – сказалі супрацоўнікі *Lietuvos Rytas*. НАВІНЫ ж у сваю чаргу спадзяюцца, што Сямён Шарэцкі ў бліжэйшы час зробіць афіцыйную заяву, якая магла б зняць усе пытанні, узнятыя вакол таямнічага «з'яўлення Ганчара» ў Вільні. ■

СЕРАДА з Аляксандрам ДУБРАВІНЫМ

Сон

Быў сон. Быццам сядзім мы ўсей грамадой у вялікім светлым пакоі, робім загавар на амерыканскія грошы супраць рэжыму. Тут адчыняюцца дзверы і ўваходзіць Аляксандр Рыгоравіч у прыгожай доўгай кашулі-вышыванцы. Ясна зрабілася ад яго, як ад сонца. Стаў у парозе і кажа прыкладна так:

— Здрастуйце, гаспада апазіцыя! Прасцеце міня за ўсе прэжніе ашыбкі. Давайце мірыцца. Давайце ўместе нашу Родзіну, то есть Бацькаўшчыну, спасаць пачнём.

Тут усе, натуральна, радасна абступілі яго, па плячах ляпаюць, рукі цісنуць, трасуць, абдымаюць. Вэрхал паднялі.

Зноў дзверы рыпяць. Уваходзяць Чыгір, Клімаў ды Кудзінаў. Прыгожыя, адпачыўшыя, вясёлыя, у новых гарнітурах:

— Здарова, пане-браце! А вось і мы!

Толькі ўсе да іх кінуліся, каб гушкаць ды «ўра» крычаць, як Лукашэнка нібыта ўстаў і кажа:

— А цяпер ваша вочарадзь прасіць ізвіненія за то, што падазравалі міня в пахішчэніях людей.

Глянулі... Авой! Ідуць Віннікава, Захаранка ды Ганчар з Красоўскім. Усміхаюцца шчасліва, кланяюцца грамадзе. Жывыя! Здаровыя! Толькі крышку заспаныя.

— Ну вот, — кажа Аляксандр Рыгоравіч, — надзеюсь большэ нет недаразуменій?

Тут выступае наперад Зянон Пазьняк і кажа сурова і мужна:

— Мы ўсе памыліліся ў гэтым чалавеку. Мне толькі што паведамілі, што ён разарваў ганебны Саюз з Масквой, перайменаваў вуліцу Камуністычную ў Народнафронтаўскую, загадаў вярнуцца да законнай Канстытуцыі і сімволікі, ды адмяніў усе свае дэкрэты! Ура яму! Віват! Паставім Лукашэнку манумент на плошчы Незалежнасці і выберам прэзідэнтам на пяцьдзесят гадоў!

Цяжка перадаць, які тут вэрхал падняўся. Колькі грамада радавалася ды ў далоні пляскала! Стольки шчасця было. А потым прыбеглі замежныя паслы. Наперадзе Спекхард з мокрым ад пачуццяў тварам:

— Дадзім вам беспрацэнтных крэдытаў на аднаўленне разбуранай гаспадаркі. Сто мільярдаў! Долараў. На сто гадоў!

— А мы дадзім дзвесце мільярдаў. Дойчмарак, — кажа ў паўзе нямецкі пасол Вінкельман. — Проста так. Бясплатна.

Тут зноў зарыпелі дзверы...

Прачнуўся ад раптоўных гукаў радыё. Быццам нехта лобзікам распілоўваў начоўку. «Мы, беларусы, з братняю Руссю...» Прачынайся, Беларусь!

«Марш свабоды»: заяўка пададзеная

Аляксей ШЫДЛОЎСКІ

Днямі ў Мінгарвыканкам за подпісамі 22 арганізатараў была пададзеная заяўка аб правядзенні «Маршу свабоды». Акцыя, якая адбудзецца 17 кастрычніка, будзе праходзіць пад дэвізам: «За перагаворны працэс, за інтэграцыю ў Еўрапейскую супольнасць». Мяркуемы пачатак шэсця — 12 гадзінаў. Далей на маршруце плошча Якуба Коласа — плошча Незалежнасці з перакрыццём руху транспарту павінна пайсці калона колькасцю да 100 тысяч чалавек. Ужо на галоўнай плошчы краіны з 14 да 18 гадзінаў будзе адбывацца мітынг, а таксама ажыццяўляцца разнастайныя задумкі арганізатараў. Яны пакуль што не раскрываюцца, але вядома, што будуць ужытыя тэхналогіі правядзення масавых мерапрыемстваў з некаторых краінаў Еўропы і Югаславіі, у прыватнасці.

На думку арганізатараў, цяпер «народ стаіць на рубяжы рашучасці, і калі гэты рубеж будзе пераадолены, «Марш свабоды» стане самай гучнай акцыяй апошніх гадоў».

На пытанне журналістаў, што будзе, калі акцыю перапраўяць на плошчу Бангалор, Зміцер Бандарэнка адзначыў, што пляцоўка на Бангалор не прыстасаваная да правядзення падобных мерапрыемстваў, і таму мы ў першую чаргу будзем кіравацца бяспекай удзельнікаў «Маршу свабоды».

Таксама былі прадэманстраваныя наклейкі, якія з'явіліся на вуліцах Мінска, з эмблемай «Маршу свабоды» і гэткія ж значкі. ■

ФОТАФАКТ

Фота Ул.ШЛАПАКА

● Беларускія альпіністы штурмуюць вышыню на вуліцы Інтарнацыянальнай

НАЗІРАЛЬНІК

О вреде предохранения

Валентина ТАРАН

Надоело писать о белорусском телевидении только в негативном плане — вроде бы там ничего хорошего и не происходит. Несправедливо это! А задуматься заставил казус, связанный с телевидением украинским, ставшим достоянием общественности на минувшей неделе.

Как известно, на президентский пост на предстоящих выборах в этой стране претендует нынешний президент и не менее 12 членов Верховной Рады Украины. Естественно, депутаты не могли упустить шанс использовать парламентскую трибуну для критики главного оппонента в день отчета правительства. Но от критики есть польза только тогда, когда она транслируется по радио и телевидению. Это и мы проходили в свое время. До сих пор в ушах звенят обличительные речи пламенного депутата ВС 12-го созыва Александра Лукашенко. Где бы он сейчас трудился, кабы не гласность и свобода слова шестилетней давности? Вот-вот! И Леонид Кучма знает о роли ТВ, и посему на парламентские слушания украинское телевидение камеры не представило. Разразился скандал — без телекамер критиковать действующую исполнительную власть депутаты отказались и даже потребовали наказать Кучму за лишение депутатов эфира.

Руководитель республиканского телевидения Вадим Долганов попытался взять огонь на себя, но ему не поверили, посчитав, что самостоятельно на такой шаг он пойти не посмел бы. Выражая образно эту мысль, один из депутатов прямо с трибуны заявил: «Кто уполномочил господина Долганова быть политическим презервативом, который предохраняет сегодня народ от реальной жизни и правды?»

И вот теперь хочется сказать о тех положительных тенденциях, которые, в противовес телевидению украинскому, наметились на отечественном ТВ. Здесь, пусть пока в единичных случаях, но явно решили не выполнять функции политического изделия №2, а напротив говорить народу правду, только правду и ничего кроме правды. Например, на стенах домов или в лифтах наши люди, как сторонники президента, так и его недоброжелатели, постоянно в реальной жизни наблюдают всевозможные призывы с упоминанием некого Луки. Возможно — горьковского. БТ мужественно не стало уходить от правды жизни: раз этот герой востребован народом, — значит, об этом нужно напоминать постоянно. И телевидение сумело-таки найти смелое и оригинальное решение. В одной из ежедневно демонстрируемых на белорусском экране реклам, имеющих социальную направленность, как отражение суровой действительности на всеобщее обозрение выставлено настенное графитти «Луку — на муку!» Аплодисменты!

Но еще большее впечатление произвело недавнее выступление вице-премьера Бориса Батуры, который в программе «Панарама» заклеймил паникеров из «желтой прессы», сообщивших, что из-за неурожая зерновых Беларусь вынуждена менять картофель на зерно, в связи с чем, мол, и возникли перебои с водкой, так как для ее изготовления нет сырья. Борис Батура не верит «желтой прессе» и нам не советует.

Согласны, позволим лишь короткую выдержку из оной прессы: «*Серьезную обеспокоенность вызывает у столичных властей почти 50-процентная нехватка картофеля. Дело в том, что большое его количество идет на бартер в Россию, где в этом году мало картофеля, но достаточно много зерна. В итоге за один килограмм картофеля мы получаем полтора килограмма в основном кубанского зерна, что в принципе специалисты считают удачным обменом. Как оказалось, в связи с нехваткой картофеля возникают некоторые проблемы уже сегодня, в том числе и перебои с водкой. Выросшая до 80 тысяч белорусских рублей цена на картофель не позволяет использовать его в качестве сырья для производства спирта*»...

Вице-премьер осудил публикацию ложных сведений очень оперативно. В день их появления — 22 сентября! Утром — «деза» в газете, вечером — «опровержение» в куплете по телевидению! А главное, мужественно и нелицеприятно, с открытым забралом против клеветников из «желтой» газеты. Называется она — «Советская Белоруссия». И отчаянное БТ не испугалось цветовой характеристики печатного органа администрации президента. Разве это не достойно восхищения?

В связи с последними новациями белорусского канала так и хочется еще раз обратиться к писателю, воспевшего не только Луку: «Безумству храбрых — поем мы песню!» Дерзайте, уважаемые телевизионщики, мы внимательно будем и дальше наблюдать за всеми изменениями нашего ТВ в лучшую сторону. ■

ЦЫТАТА НУМАРА

Калі Ленін прыехаў у красавіку ў Расею, ён жа да таго ўсё жыцьцё пражыў у Швейцарыях. Калісьці людзі гэта добра ведалі. Цяпер забыліся. Барані Бог, каб зь Зянонам тут што здарылася як з Захаранкам ці Ганчаром.

Яўген ШАТОХІН
Газета «Наша ніва», 27 верасня 1999 года

Да «Маршу свабоды» засталося 18 дзён

Мінск МАРШ 17 СВАБОДЫ кастрычніка

ЗАМЕЖЖА

Парламентарии Молдовы за свободу А.Климова и В.Кудинова

Пресс-центр БАМП

12 депутатов парламента Молдовы, включая председателей трех комитетов — по международным делам, по экономике и сельскому хозяйству, поставили свои подписи за освобождение Андрея Климова и Владимира Кудинова. Как заявил заместитель председателя парламентского большинства Александру Мозану, «наш коллега, депутат молдавского парламента, вот уже семь лет томится в застенках Приднестровья, поэтому мы как никто другой понимаем проблему белорусских депутатов—политзаключенных». ■

Расія — банкрут

Расціслаў ПЕРМЯКОЎ

Так сцвярджае міжнароднае рэйтынгавае агенцтва *Fitch IBCA* на падставе доўгатэрміновай праверкі расійскіх запазычанасцяў і ацэнкі эканамічнага стану краіны. Сапраўды, агульны аб'ём расійскіх даўгоў складае каля 160 мільярдаў долараў – гэта больш чым па тысячы долараў на кожнага грамадзяніна, разам з старымі і немаўлятамі. ■

Куды падзець 115 мільярдаў?

Міхась КАРПОВІЧ

У Амерыцы – новы галаўны боль: урад і прэзідэнт не ведаюць, што рабіць з 115 мільярдамі долараў. Менавіта на гэтую суму сёлета сабраныя падаткі перавысяць памеры дзяржаўных расходаў ЗША. Стварыўся гэтак званы прафіцыт бюджэту. Пра гэта паведаміў Біл Клінтан у час свайго выступлення. Ён падкрэсліў, што ў 1992 годзе, калі ён прыйшоў да ўлады, сітуацыя карэнным чынам адрознівалася — бюджэт быў «у мінусе» на 290 мільярдаў. Хутчэй за ўсё, «лішнія» грошы будуць патрачаныя на павелічэнне пенсіяў, выплат па сацыяльным страхаванні і медыцынскія праграмы для людзей сталага ўзросту, адукацыю і абарону навакольнага асяроддзя, выплату нацыянальнага доўгу і нават на паніжэнне некаторых падаткаў. ■

Галодныя гандляры зброяй

Расціслаў ПЕРМЯКОЎ

Паўночная Карэя апошнія гады актыўна гандлявала зброяй. Пра гэта паведаміла дзяржаўнае агенцтва Ёнхэп. Згодна з паведамленнем, Паўночная Карэя зарабіла на гэтым 800 мільёнаў долараў. Сярод прададзенай тэхнікі былі нават ракеты «Скад». Як вядома, апошнія некалькі гадоў у краіне перамогшага чучхе доўжыцца беспрэцэдэнтны голад, у выніку якога ўжо памерла не менш за мільён чалавек. Аднак грошы ад продажу старой ваеннай тэхнікі пайшлі не на харчовае забеспячэнне краіны, а на набыццё новай зброі. ■

АФІЦЫЙНАЕ ЎДАКЛАДНЕННЕ

Ні Быкаў, ні Барадулін згоды не давалі!

Афіцыйна паведамляю Вам, што ні Васіль Быкаў, ні Рыгор Барадулін не давалі сваёй згоды выбірацца ў Сойм Партыі БНФ, калі з'езд Партыі будзе склікацца асобна ад з'езду БНФ «Адраджэньне» — г.зн. весьці да расколу ў арганізацыі.

Л.БАРШЧЭЎСКІ,
в.а.старшыні БНФ «Адраджэньне» і Партыі БНФ,
28.09.99 г.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Анатолий ЛЕБЕДЬКО: «Свой ресурс режим уже выработал»

Сергей ШАПРАН

В последнее время «звезда» Анатолия ЛЕБЕДЬКО еще больше засверкала на международном небосклоне. В ходе своих поездок «по Европам» депутат Верховного Совета и заместитель председателя Объединенной гражданской партии одерживает победу за победой. Нынешнему министру иностранных дел Уралу Латыпову, должно быть, есть чему поучиться у своего молодого конкурента.



На днях Анатолий Лебедько вернулся из Страсбурга, где проходила Парламентская ассамблея Совета Европы. Белорусский депутат был приглашен на нее в качестве председателя Комиссии по международным делам Верховного Совета. Через три дня после возвращения в Минск Лебедько отбыл в США для встреч с конгрессменами и сенаторами. О целях и результатах этих поездок Анатолий Лебедько рассказывает в интервью нашему изданию.

— Каков итог вашего визита в Страсбург?

— Бюро ПА СЕ приняло резолюцию по ситуации в Беларуси. Это «многоцелевая» резолюция, в которой есть не только пункты, связанные с исчезновением людей в Беларуси, но и затрагивается целый ряд политических и юридических проблем. И что самое важное — это не разовая резолюция. Отныне Парламентская ассамблея будет регулярно отслеживать нашу ситуацию и постоянно проводить мониторинг — в каком направлении идет развитие той или иной проблемы, которая и была отражена в этой резолюции.

— Что в первую очередь интересовало тех должностных лиц, с кем вы встречались?

— Новый генеральный секретарь Совета Европы Швиммер заявил о том, что для него существуют два приоритета — Балканы и Беларусь. Это дает основания говорить о выработке определенной стратегии и тактики Совета Европы по отношению к Беларуси. Кроме того, руководство этой международной структуры высказывает большие сомнения относительно вступления Беларуси в Совет Европы. Скорее всего, план МИДа о вступлении в Совет Европы так и останется набором благих пожеланий.

— С какой целью вы теперь едете в США?

— Я получил приглашение от Конгресса США, где мне будет организован целый ряд встреч с конгрессменами, сенаторами, а также в Государственном департаменте. Одна из наших задач – остановить опасную тенденцию исчезновения людей.

— Очевиден выигрыш оппозиции на международном направлении. Не так ли?

— Однозначно. По сути, несколько человек из оппозиции сегодня работают гораздо эффективнее, чем целое министерство иностранных дел со штатом в несколько сотен сотрудников! Ведь легитимизация на международной арене незаконных белорусских структур так и не произошла, хотя на это были брошены огромные силы и ресурсы, к этому подключилась даже Россия. Однако факта международного признания Лукашенко по-прежнему нет во многом из-за политики самоизоляции, которую он проводит.

Я не знаю ни одной страны, где бы оппозиция находилась в условиях, аналогичных нашим. В той же Югославии возле резиденции Милошевича с утра собираются оппозиционеры и начинают готовить площадь для стотысячного митинга. И это в стране, где правит человек, признанный Гаагским судом военным преступником! Возможно ли у нас такое? Нет. Тем не менее, белорусская оппозиция жива и активно борется.

— Сейчас многие связывают свои надежды с политиками «новой волны» белорусской оппозиции и с Маршем свободы. Какие надежды вы возлагаете на эти инициативы?

— Мы исходим из того факта, что есть миллионы недовольных режимом. И надо искать новые методы работы, предложить новых людей, способных донести идеи, которые из уст официальных лидеров оппозиции сегодня не воспринимаются. Но я готов тысячу раз повторить, что инициатива, получившая название «новая волна», ни в коем случае не есть противопоставление «генеральному штабу» белорусской демократии.

Что касается «Марша свободы», то он задумывается как самая массовая политическая акция этого года. Последние действия властей свидетельствуют о том, что для этого есть все предпосылки. Правда, сложно сказать, как же будут в дальнейшем развиваться события, потому что исчезновение Гончара — это серьезный фактор психологического воздействия. Власть пытается играть по старым нотам, используя старые приемы — чувство страха, неуверенности. Но она не понимает, что есть грань, за которой не действует даже страх. И нужен только повод, предлог, чтобы недовольство выплеснулось. Более того, может возникнуть ситуация, когда никто не сможет контролировать положение, даже оппозиция. И тогда может произойти бунт. Поэтому мы сегодня предлагаем власти другой путь.

— Вы имеете в виду переговорный процесс?

—Да. Одна из задач «Марша свободы» — это голос в поддержку переговорного процесса. Именно переговорного, потому что до сегодняшнего дня идет лишь его имитация. С одной стороны, власть говорит, что оппозиция получит место в президентской «Советской Белоруссии», а с другой стороны, независимые газеты подвергаются давлению и репрессиям.

Свой ресурс режим уже выработал. Он не может развиваться. Лукашенко не готов к новым реалиям. Поэтому для него все плохо: переговорный процесс — это плохо, поскольку в этом случае, по мнению Лукашенко, он демонстрирует свое бессилие, теряет контроль. Введение жесткой диктатуры — также бесперспективно, так как экономическая ситуация ухудшается. Выход один — проведение настоящих переговоров между властью и демократической оппозицией об условиях проведения действительно свободных и демократических выборов в новый парламент под международным контролем. Такие переговоры станут реальностью, когда в их поддержку открыто выступят десятки тысяч демонстрантов. ■

МЕРКАВАННЕ КРАІНЫ

Мы продолжаем публикацию результатов августовских социологических исследований, которые проводит лаборатория «НОВАК» Андрея Вардамацкого. Опрос был проведен 10-16 августа 1999г. Репрезентативная выборка — 1.097 человек.

Президент нелегитимен?

Очевидно, что жители белорусской столицы более информированы, чем жители периферии. Скорее всего именно недостаток информации сказался на том, что разница в числе тех, кто согласен с фактом наличия проблемы легитимности, составляет 18,7%. Но даже несмотря на это число граждан, считающих, что проблема легитимности Александра Лукашенко существует, больше, нежели отрицающих этот факт. Большинство из них выход из ситуации видят в проведении выборов в Верховный Совет по Конституции 1994 года либо переговорах между властью и оппозицией.

Около 20% опрошенных, ответивших утвердительно на первый вопрос, считают, что проблему легитимности можно решить, проведя выборы по Конституции 1996 года. Налицо парадокс, ведь именно Конституция 1996 года привела к появлению такой проблемы, как легитимность президента. ■

УСХОДНІ НАПРАМАК

Дачакаліся?

1 кастрычніка ў друку варта чакаць публікацыю праекта Дагавора аб стварэнні Саюза Расіі і Беларусі

Алег САКАЛОЎ

Прэзідэнт Расіі ў цэлым адобрыў праект Дагавора аб стварэнні саюзнай беларуска-расійскай дзяржавы. Як паведамілі афіцыйныя беларускія крыніцы, 27 верасня Барыс Ельцын даручыў прэм'ер-міністру Расіі Уладзіміру Пуціну, кіраўніку сваёй адміністрацыі Аляксандру Валошыну і міністру замежных спраў Ігару Іванову забяспечыць публікацыю тэкста Дагавора для ўсенароднага абмеркавання. Чакаецца, што гэта можа адбыцца ў самы бліжэйшы час — магчыма, 1 кастрычніка — адначасова ў шэрагу беларускіх і расійскіх цэнтральных СМІ. Канчаткова тэрміны публікацыі тэкста Дагавора будуць вызначаныя пасля іх узгаднення з беларускім бокам.

У адным з нядаўніх інтэрв'ю намеснік міністра па справах СНД Расіі Ігар Савольчанка паведаміў, што, згодна з праектам Дагавора, саюзнай дзяржавай будзе кіраваць Вышэйшы дзяржаўны савет, дзе рашэнне плануецца прымаць па схеме: адна дзяржава — адзін голас. Праект Дагавора прадугледжвае стварэнне Савета міністраў, у склад якога ўвойдуць кіраўнікі ўрадаў і ключавых міністэрстваў і ведамстваў дзвюх краінаў, а таксама двух палатнага парламента саюзнай дзяржавы. Адна з палат гэтага парламента будзе фарміравацца шляхам дэлегіравання на парытэтнай аснове, другая — абіраца. У ёй, зыходзячы з агульнай колькасці выбаршчыкаў, прадстаўнікоў Расіі будзе, адпаведна, больш.

Паводле вынікаў усенароднага абмеркавання праекту Дагавора Выканкаму Саюза Беларусі і Расіі трэба будзе ўнесці папраўкі ў ягоны тэкст. Час правядзення рэферэндуму па абмеркаванні гэтага дакумента пакуль не вызначаны. Старшыня Дзяржаўнай думы Расіі Генадзь Селязнёў на нядаўняй прэс-канферэнцыі выказаў думку, што рэферэндум аб аб'яднанні Беларусі і Расіі ў канфедэрацыйную дзяржаву можа адбыцца да канца 1999 года. Разам з тым у Кіраўскай вобласці Расіі зарэгістравана ініцыятыўная група па правядзенні рэферэндуму аб аб'яднанні Расіі і Беларусі. Яе ўзначаліў дэпутат Дзяржаўнай думы РФ Мікалай Ганчар. ■

Категории недвижимости - 2

Константин ТАРАСОВ, Владимир ШЛАПАК (фото)

В предыдущем номере НАВІНЫ опубликовали Представление Прокуратуры РБ министерству культуры, которое обобщало результаты проверки деятельности Государственной инспекции по охране историко-культурного наследия и ставило вопрос о соответствии председателя ГИнОН Бубновского Д.С. занимаемой должности, а также о необходимости усиления контроля, исправления недостатков и т. п. Напомним, что Представление было продатировано 7 июля 1995 года.

Обращение к гаранту Конституции

Того же месяца того же года президент А.Лукашенко (второй адресат — Верховный Совет) получил письмо, подписанное председателем ГИнОН Д. Бубновским, которое называлось «О проблемах действенности Закона РБ «Об охране историко-культурного наследия». Председатель не забыл похвалиться перед президентом страны, что он *«как руководитель группы разработчиков этого законопроекта ставил целью создать такой нормативный документ, который обеспечивал бы выявление, учет, сохранение, реставрацию, воссоздание, возврат и приумножение созданных нашим народом историко культурных ценностей...»*, но *«без влияния крайне опасных для историко-культурного наследия политических страстей»*. Далее заботливый автор открывал президенту глаза на бездействие Прокуратуры Республики *(«...ГИнОН получала от Прокуратуры отказы о привлечении к ответственности виновных лиц, либо не получала никаких ответов вообще»)* и, что важнее, на политическую заданность прокурорского внимания: *«В то же время рассмотрение организованных определенными лицами (не отличающимися уважением к Закону, но претендующими на роль общественных и политических лидеров) и переадресованных ими на адрес Прокуратуры Республики Беларусь обращений является для отдельных сотрудников и структурных подразделений Прокуратуры основным занятием»*. В письме деликатно не названы имена *«политизированных респондентов»* Прокуратуры, *«не скрывающих свое неуважение к Закону»*. Все же Д. Бубновский решил высказать президенту свое личное мнение о скрытных целях прокурорских проверок, возглавляемого им подразделения: *«Создается впечатление, что более чем двухмесячная проверка Прокуратурой.... имеет целью расчистку пути определенным несостоявшимся политическим лидерам, проведения их отвергнутой обществом псевдонациональной политики через государственные органы и учреждения»*.

Разумеется, вообразить связь между незаконными разрешениями ГИнОН на снос исторических памятников и «расчисткой пути несостоявшимся политическим лидерам» весьма трудно. Но может обеспокоить.

Не были обойдены вниманием в обращении к президенту и конфликты ГИнОН с министерством культуры, в первую очередь, финансовые. Д. Бубновский отметил *«келейность распределения средств, выделяемых на цели реставрации из государственного бюджета... В результате участились случаи нерационального использования выделяемых на реставрацию государственных средств, часть из которых, образно говоря, была выброшена на ветер»*. (Конкретизация таких неприглядных случаев, к сожалению, не приводится.) Председатель ГИнОН сообщил президенту, что *«министерство культуры и печати выявило склонность, вопреки требованиям Закона, концентрировать только в своих руках проведение государственной политики в области возврата историко-культурных ценностей. При этом отмечены неоднократные случаи утаивания информации по этому вопросу от Правительства, Верховного Совета и Администрации Президента Республики Беларусь»*. С чувством заботы о гражданском порядке Д. Бубновский пишет А.Лукашенко, что *«полномочия ГИнОН в последнее время все чаще оспариваются... утратившими прежние формальные возможности общественными объединениями. Законность регистрации и существования таких объединений весьма сомнительна»*. Например, сомнительна законность регистрации и существования Фонда культуры, Общества краеведов или Республиканского общества охраны памятников истории и культуры. Почему? Наверное, потому, что мешают жить своими жалобами (оспариванием самовольных разрешений на реконструкцию вместо реставрации).



● Дом №2а по ул. Герцена, названный в Представлении Прокуратуры как новостройка, изменяющая исторический облик «Верхнего города»

● Улица Витебская, дом №10, перестроенный с нарушениями исторического архитектурного облика

«Заслушав и обсудив»

Не берусь судить, читал ли это письмо президент Лукашенко, но в сентябре того же года коллегия министерства культуры рассматривала вопрос об этом письме Д.С. Бубновского и о Представлении Прокуратуры. В то время делопроизводство в министерстве культуры велось на белорусском языке, поэтому цитаты из документа привожу на языке оригинала, чтобы избежать неточностей, поскольку самая точная наука — это бюрократия. Коллегия, «заслухаўшы і абмеркаваўшы», записала в своем решении: *«Непрыданне катэгорый аховы гісторыка-культурным каштоўнасцям дазволіла старшыні ДзІнАС Бубноўскаму, які працуе на гэтай пасадзе са снежня 1992 г., самастойна ўзгадняць дакументацыю... З ведама ДзІнАС у ліпені 1994 г. быў знесены жылы дом — гісторыка-культурная каштоўнасць XVIII—XIX стст. па вул. Інтэрнацыянальнай, 5а, на месцы якога пачата будаўніцтва высотнай гасцініцы «Еўропа», «былі снесены будынкі па вул. Герцэна і Інтэрнацыянальнай»*. Ну и как обычно решение констатировало: «не ўтворaны... не праводзіцца... не прыцягнута».

В постановительной части коллегия министерства согласилась с выводами Представления Прокуратуры Республики Беларусь и поддержала ходатайство перед Кабинетом министров о соответствии Д.Бубновского занимаемой должности председателя ГИнОН.

Контроль за претворением решений в жизнь был поручен министру А. Бутевичу.

Прошло три года

Спустя три года уже новый министр культуры А.Сосновский получил (25 июня 1998 г.) Представление Прокуратуры РБ об устранении нарушений законодательства об охране историко-культурного наследия и Закона об обращениях граждан. Это Представление подписано Генеральным прокурором РБ О. Божелко. Оно касается в основном все того же ГИнОН, возглавляемого все тем же Д. Бубновским. Представление сообщает, что *«конструкции памятника архитектуры по ул. Герцена, 2а были полностью разобраны, а затем уничтожены. Предполагалось впоследствии восстановить памятник в новых материалах. С 1996 г. собственником его стало ООО «Билим», которым подписано охранное обязательство... Согласно заключению произведенной в процессе проверки Прокуратурой экспертизы научно-проектной документации, а также возведенного объекта по ул. Герцена, 2а, последний не является аутентичным памятником архитектуры. Кроме того, проектная документация является проектно-сметной документацией на новое строительство, а не научно-проектной документацией на реставрационно-восстановительные работы... Разработанные проектные решения ни в коей мере не воссоздают прежний исторический облик памятника, а полностью изменяют его формы и размеры, внутреннюю планировку, характер декора... Реализация современных пристроек к зданию полностью искажает планировочную структуру и исторический ландшафт этой части «Верхнего города»*.

Подобные нарушения отмечены в Представлении Прокуратуры относительно домов 31, 31а, 33, 33б по ул. Интернациональной, дома № 10 по ул. Витебской в Минске, который входит в комплекс «Раковское предместье»: *«Возведенный на месте памятника объект (существенно утративший после «восстановления» первоначальные исторические формы и объем, а также дополненный новой современной пристройкой) потерял свои аутентичные качества. Собственником объекта является ООО «Трайпл», которое, согласно проекту, приспособило здание под пивной бар с мини-пивзаводом»*.

Обширное Представление затрагивает множество вопросов и предлагает их незамедлительно решить. Судя по сегодняшнему внешнему виду реставрируемых объектов, все эти вопросы будут решаться с противоположной скоростью.



● Минск, пл. Свободы. Памятник археологии — подвалы торговых рядов XVIII-XIX вв., которым угрожает полное уничтожение

Молох реставрации

У А. Твардовского в поэме «Василий Теркин на том свете» есть строки:

Это словно как машина
Скорой помощи идет:
Сама режет, сама давит,
Сама помощь подает.

Такова наша Госинспекция по охране: сама позволяет, сама утверждает к разрушению отдельные памятники в заповедной зоне, что засвидельствовано проверками Прокуратуры, сама пишет президенту. Каково будет очередное обращение Д. Бубновского к А.Г.Лукашенко, естественно, пока неизвестно.

На жалобы граждан по поводу охраны памятников сегодня никто не обращает внимания, да и легко ответить, что отдельные граждане — не специалисты и совершенно не понимают, что такое реставрационная культура-мультура. Хотя простому человеку достаточно знать, что любая новосозданная вместо памятника красота ничего не стоит. Можно построить в Минске Петродворец, Нотр-Дам, Московский Кремль, но историко-культурная ценность этих мировых шедевров будет равна нулю. Им не присвоят категорию «0» (мировые шедевры). Это нулевые муляжи. Вот сейчас у нас преобладает не реставрация, а именно создание муляжей, поскольку нарушается аутентичность по всем условиям — форма, материалы, технология. У нас действует Молох реставрации. Обмануты не только обычные граждане, у которых с бендеровской смелостью отнимают культурное (архитектурное) наследие. Удивительнее то, что мелкие и средние чиновники смело обманывают вышестоящих, тех, кто не знает тонкостей реставрации. Вот было бы интересно посмотреть, что сказали бы С.Лингу зарубежные специалисты, если бы премьер привез их в «Верхний город» Минска похвалиться успехами восстановления памятников прошлых столетий. Сколько бы дней после этого служба ГИнОН и «Стары Менск» работали бы в привычном для них режиме создания новостроев для долевых вкладчиков на месте сносимого бульдозером культурного наследия? ■

© НАВІНЫ. Спасылка на газету НАВІНЫ абавязковая. Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў, публікаваць артыкулы дзеля палемікі
Адрас: г.Мінск, пр-т газеты «Известия», 8-173. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 996
Выдаецца з 16 студзеня 1998 г. В.а. галоўнага рэдактара і заснавальнік Павел Жук. Выдавец — рэдакцыя газеты НАВІНЫ. Адрас для карэспандэнцыі: 220034, г. Мінск, вул. З.Бядулі, 6-47. Тэл./факс: 236-89-40.
E-mail: NPSvaboda@irex.minsk.by Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) Заказ 604 Нумар падпісаны ў друк 28/09/99 (15:00) Наклад — 16.950